**С.В.Зыгмантовіч,** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# РЭКАМЕНДАЦЫЙНАЯ БІБЛІЯГРАФІЯ: ДА ВЫЗНАЧЭННЯ ПАНЯЦЦЯ

Сацыяльныя працэсы, якія адбываюцца ў свеце, змянілі звыклыя парадыгмы, рэгулятыўныя прынцыпы, падыходы да навуковых пошукаў, кірункі практычнай дзейнасці, у тым ліку і ў галіне рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці.

Рэкамендацыйная бібліяграфія ў розныя перыяды мела рознае сацыяльнае прызначэнне. Змяненне функцый рэкамендацыйнай бібліяграфіі можна прасачыць па тых азначэннях, якія прыводзяцца ў нарматыўных дакументах, прафесійных даведачных выданнях.

У “Словаре книговедческих терминов” (1958) чытаем: “Рэкамендацыйная бібліяграфія – бібліяграфія, якая ставіць сваёй задачай актыўнае кіраванне чытаннем або актыўную дапамогу ў выбары кніг вызначанай катэгорыі чытачоў шляхам падбору літаратуры, яе характарыстыкі і ацэнкі” [10, с. 252].

У дзяржаўным тэрміналагічным стандарце “Библиография. Термины и определения” (1977) ужо адсутнічаюць словы аб кіраванні чытаннем, але ёсць указанне на прапаганду ведаў: “Рэкамендацыйная бібліяграфія – гэта бібліяграфія, якая садзейнічае агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі, прапагандзе навуковых і палітычных поглядаў” [1].

У выданні “Библиотечное дело: терминологический словарь” (1986) у вызначэнне дабаўлена выхаваўчая функцыя і зняты палітычны аспект функцыі прапаганды. Адзначаецца, што “рэкамендацыйная бібліяграфія – спецыяльная бібліяграфія, якая садзейнічае агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі працоўных, іх выхаванню і прапагандзе ведаў” [4, с. 127].

У “Терминологическом словаре по библиотечному делу и смежным отраслям знания” (1995) фармулёўка паўтараецца, але замест “працоўных”, “чытачоў” уводзіцца паняцце “спажыўцы інфармацыі” [12, с. 161].

У энцыклапедычным слоўніку “Книговедение”, выдадзеным у 1982 г., у вызначэнні рэкамендацыйнай бібліяграфіі падкрэслена яе значнасць для развіцця культуры чытання [11, с. 440].

У энцыклапедыі “Кніга” (1999) з’яўляюцца словы “грамадскае прызначэнне” і “асвета”: “Рэкамендацыйная бібліяграфія – від

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

бібліяграфіі, грамадскае прызначэнне якой – садзейнічаць агульнай адукацыі, самаадукацыі, выхаванню, асвеце і культуры чытання” [7 , с. 526].

У беларускім слоўніку бібліятэчна-бібліяграфічных тэрмінаў (2000) азначэнне разглядаемаму віду бібліяграфіі таксама даецца праз яго грамадскае прызначэнне: садзейнічаць агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі чытачоў і прапагандзе ведаў [8, с. 173].

У апошнім выданні “Библиотечной энциклопедии” (2007) А.М.Гарбуноў прапаноўвае наступную дэфініцыю: “Рэкамендацыйная бібліяграфія (асветніцкая, папулярная) – галіна дзейнасці, якая забяспечвае чытачоў бібліяграфічнай інфармацыяй з улікам іх дыферэнцыраваных патрэбнасцей у сферы адукацыі і самаадукацыі, выхавання і фарміравання асобы” [6, с. 855].

Прыведзеныя прыклады адлюстроўваюць залежнасць спадзяванняў грамадства ў адносінах рэкамендацыйнай бібліяграфіі да часу. Так, у “хрушчоўскую адлігу” намаганнямі бібліятэказнаўцаў з прафесійнай літаратуры выціскаецца паняцце “кіраўніцтва чытаннем”. Знікае яно і з вызначэнняў рэкамендацыйнай бібліяграфіі. У 1990-я гг., перыяд актыўнага развіцця інфарматызацыі, чытачы, карыстальнікі рэкамендацыйнай бібліяграфіі называюцца спажыўцамі інфармацыі. У перабудовачныя часы знікае з прафесійных слоўнікаў слова “асвета”. Выключаецца з прызначэння рэкамендацыйнай бібліяграфіі функцыя “садзейнічання прафесійнай адукацыі”, яна звязана з паняццем “прафесійна-вытворчая бібліяграфія” або, як прапануе яе называць І.Г.Маргенштэрн, “прафесійна-дапаможная бібліяграфія”. Хаця апошняе паняцце не атрымала шырокага практычнага ўвасаблення, але ўведзена і нарматыўна замацавана ў тэрміналагічных стандартах [9]. Няма адзінства ў падыходах да метасістэмы, у якую ўваходзіць складанай часткай рэкамендацыйная бібліяграфія (у прыведзеных вызначэннях падкрэсліваецца, што гэта від бібліяграфіі, галіна дзейнасці і г.д.). І, нарэшце, мы бачым выкарыстанне ў якасці сінонімаў тэрміна “рэкамендацыйная” бібліяграфія такіх тэрмінаў, як “папулярная”, “асветніцкая” бібліяграфія.

Трэба адзначыць, што ў ДАСТ 7.0–99 “Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения” [3] няма азначэнняў відаў бібліяграфіі, як і ў папярэднім тэміналагічным стандарце [2], але прыводзяцца азначэнні як

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

рэкамендацыйнага, так і папулярнага бібліяграфічнага дапаможніка. Азначэнне паняцця “рэкамендацыйны бібліяграфічны дапаможнік” (бібліяграфічны дапаможнік, які адлюстроўвае дакументы, рэкамендаваныя пэўным катэгорыям чытачоў і адабраныя па адпаведных зместавых і якасных крытэрыях) па сутнасці тоесна азначэнню “спецыяльны бібліяграфічны дапаможнік” і падразумявае і навукова-дапаможныя, і вучэбна-дапаможныя, і прафесійна-вытворчыя, і папулярныя ў тым ліку. Дэфініцыя папулярнага бібліяграфічнага дапаможніка наступная. “Гэта бібліяграфічны дапаможнік, прызначаны для задавальнення пазнавальных інтарэсаў шырокага кола чытачоў”. Такая тэрміналагічная нястрогасць у вызначэннях ДАСТ прыводзіць да таго, што сёння ў спецыяльнай літаратуры можна знайсці розныя мадыфікацыі былога традыцыйнага тэрміна “рэкамендацыйная” бібліяграфія: рэкамендацыйная (папулярная); асветніцкая (рэкамендацыйная); рэкамендацыйная; папулярная; папулярна-асветніцкая. Удакладненні ў дужках пацвярджаюць неадназначнасць тэрміналагічнай трактоўкі разглядаемага тэрміна.

Спецыяліст у галіне рэкамендацыйнай бібліяграфіі М.Г.Вохрышава, аналізуючы суадносіны тэрмінаў “рэкамендацыйная” і “папулярная” бібліяграфія, адзначае, што рэкамендацыйнасць – гэта метад, які ўяўляе сабой сукупнасць прыёмаў: мэтанакіраваны адбор дакументаў з арыентацыяй на пэўныя чытацкія групы, праведзены на аснове спецыяльна адпрацаваных крытэрыяў; нефармальная групоўка дакументаў, якая адпавядае логіцы раскрыцця праблемы, значнасці матэрыялу, даступнасці да іх успрымання; стварэнне бібліяграфічнага метатэксту, які інтэрпрэтуе змест дакумента з мэтай рацыяналізацыі працэсаў успрымання і разумення тэкстаў дакументаў чытачамі. Рэкамендацыйная бібліяграфія заўсёды звязана з папулярызацыяй лепшых, найбольш каштоўных дакументаў, таму правамерна называць яе папулярнай. Але дакладней, на яе погляд, сутнасць з’явы выяўляе тэрмін “рэкамендацыйны”, які акцэнтуе актыўнасць метаду, што ляжыць у аснове гэтага кірунку развіцця бібліяграфіі [5, с. 283].

Калі спрабаваць вызначыць тэрмін “рэкамендацыйная бібліяграфія”, то неабходна ўлічваць, што на сёння рэкамендацыйная бібліяграфія ахоплівае:

– практычную бібліяграфічную дзейнасць, якая ўключае ў сябе бібліяграфічныя працэсы мэтанакіраванага пошуку дакументаў і

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

інфармацыі аб іх у адпаведнасці з узроўнем начытанасці, агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, з глыбінёй, шырынёй і ўстойлівасцю чытацкіх інтарэсаў розных груп спажыўцоў інфармацыі; падрыхтоўку бібліяграфічных паведамленняў аб дакументах з улікам рэалізацыі ацэначнай функцыі; давядзенне інфармацыі аб дакументах да чытачоў, спажыўцоў інфармацыі;

– сукупнасць вынікаў рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці ў форме традыцыйных бібліяграфічных дапаможнікаў, вусных бібліяграфічных абвяшчэнняў, электронных рэсурсаў;

– метад арганізаванага чытання, які ўключае не толькі рэкамендаваныя творы, але і парады па іх выкарыстанні;

– існаванне яе ў сінтэзе з такімі з’явамі духоўнай дзейнасці чалавека, у якіх бібліяграфічная інфармацыя неадрыўная ад іх сутнасці (у жанрах літаратурнай крытыкі, вучэбным працэсе і педагагічнай дзейнасці, кнігагандлёвай рэкламе, у розных формах папулярызацыі, у каналах мас-медыя).

Апошняя асаблівасць падкрэслівае неабмежаванасць вытворчасці і выкарыстання яе вынікаў толькі бібліятэкамі, а, значыць, і сукупнасць рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў належыць разглядаць даволі шырока, паколькі сёння ні адно вучэбнае выданне не абыходзіцца без бібліяграфічнага спісу рэкамендаванай літаратуры; прыкніжныя спісы з’яўляюцца неабходным элементам навукова-папулярных выданняў; у выдавецкай, кнігагандлёвай рэкламе галоўным аб’ектам з’яўляецца дакумент, які рэкламуецца з выкарыстаннем бібліяграфічных сродкаў, і г.д. Акрамя таго, нельга абмяжоўваць вынікі рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці толькі бібліяграфічнымі крыніцамі, што значна звужае ўяўленні аб яе магчымасцях, арэале распаўсюджвання рэкамендацыйна-бібліяграфічных абвяшчэнняў, прычым не толькі ў бібліятэках у форме вусных бібліяграфічных аглядаў, індывідуальных гутарак, але і на радыё, тэлебачанні.

Ва ўмовах выкарыстання новых камп’ютэрных тэхналогій, пашырэння аб’ектаў бібліяграфавання за кошт выданняў на электронных носьбітах інфармацыі (у тым ліку музыкальных дыскаў, фільмаў і інш.), вэб-сайтаў з рознымі відамі інфармацыі, падачы самой рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі ў Інтэрнет мы можам гаварыць аб пашырэнні яе функцый у плане не толькі фарміравання культуры чытання, але і фарміравання інфармацыйнай культуры, паколькі ў працэсе яе выкарыстання

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

спажыўцы інфармацыі маюць магчымасць асвойваць новыя мультымедыйныя, гіпертэкставыя тэхналогіі, арыентавацца не толькі ў кніжным свеце, але і ва ўсёй інфармацыйнай, культурнай прасторы, лепш бачыць і разумець існуючыя сувязі паміж другаснадакументальнай і першаснай інфармацыяй і інш.

У ліку спажыўцоў рэкамендацыйнай бібліяграфіі сёння выступае не толькі шырокае кола чытачоў з рознымі пазнавальнымі інтарэсамі, але і спецыялісты, што заняты ў сферы адукацыі, асветы, культурна-адпачынкавай, інфармацыйнай дзейнасці, якія разглядаюць і выкарыстоўваюць крыніцы рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў якасці сродкаў указаных відаў дзейнасці.

Улічваючы вышэйпададзенае, прапануем наступную дэфініцыю паняцця рэкамендацыйнай бібліяграфіі. *Рэкамендацыйная бібліяграфія* – гэта від спецыяльнай бібліяграфіі, інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджванне і выкарыстанне спажыўцамі бібліяграфічнай інфармацыі пра дакументы з улікам іх дыферэнцыраваных патрэбнасцей у сферы адукацыі, самаадукацыі, выхавання, асветы і фарміравання інфармацыйнай культуры асобы.

Пад інфраструктурай у гэтым выпадку разумеецца сукупнасць усіх суб'ектаў рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці, інфармацыйных, выхаваўчых, культурных цэнтраў, вынікаў іх дзейнасці, сістэм сувязі і тэхналогій, якія забяспечваюць доступ спажыўцоў да розных відаў інфармацыйных рэсурсаў.

Рэкамендацыйная бібліяграфія ў сістэме бібліяграфічнай дзейнасці вылучаецца актыўнай папулярызатарскай, адукацыйна-выхаваўчай, метадычнай і асветніцкай накіраванасцю. Прадукцыйнасць рэкамендацыйнай бібліяграфіі выяўляецца сёння не толькі ў мадэлі арганізаванага чытання, але і ў садзейнічанні засваенню розных відаў культуры (музыкальнай, кінематаграфічнай і інш.), арыентацыі людзей у інфармацыйным асяроддзі, абуджэнні ў іх інтарэсу да ведаў, развіцці самастойнага мыслення, умення крытычна асэнсоўваць прачытанае, убачанае, пачутае, у садзейнічанні сацыялізацыі асобы, пашырэнню яе кругагляду.

---


1. *ГОСТ 7.0–77*. Библиография. Термины и определения. – М., 1979. – 22 с.

2. *ГОСТ 7.0–84*. Библиографическая деятельность. Основные термины и определения. – М.: Изд-во стандартов, 1985. – 24 с.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ

*3. ГОСТ 7.0–99*. Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения // Стандарты по библиотечно-информационной деятельности. – СПб.: Профессия, 2003. – С. 11–39.

*4. Библиотечное* дело: терминологический словарь / ГБЛ СССР. – 2-е изд. – М.: Книга, 1986. – 224 с.

*5. Вохрышева, М.Г.* Теория библиографии: учеб. пособие / М.Г.Вохрышева. – Самара: Изд-во СГАКИ, 2004. – 367 с.

*6. Горбунов, А.М.* Рекомендательная библиография / А.М.Горбунов // Библиотечная энциклопедия. – М.: Пашков дом, 2007. – С. 855.

*7. Давыдова, М.И.* Рекомендательная библиография / М.И.Давыдова // Книга: энциклопедия. – М.: Большая рос. энцикл., 1999. – С. 526.

*8. Лявончыкаў, В.Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 2000. – 228 с.

*9. Моргенштерн, И.* Беспризорный вид библиографии / И.Моргенштерн // Библиогр. – 2005. – № 4. – С. 43–47.

*10. Словарь* книговедческих терминов / под ред. Е.И.Шамурина. – М.: Сов. Россия, 1958.

*11. Смирнова, Б.А.* Рекомендательная библиография / Б.А.Смирнова // Книговедение: энцикл. словарь. – М.: Сов. энциклопедия, 1982. – С. 440–442.

*12. Терминологический* словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания / БЕН РАН. – М., 1995. – 268 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ